ЗАЦВЯРДЖАЮ
Начальнік галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Гродзенскага аблвыканкама
А.Л.Вярсоцкі

ІНСТРУКЦЫЯ
аб парадку арганізацыі і правядзення абласнога конкурсу размоўнага жанру

1. Дадзеная Інструкцыя вызначае парадак арганізацыі і правядзення абласнога конкурсу размоўнага жанру (далей – Конкурс).
2. Мэтамі і задачамі Конкурсу з'яўляецца: стымуляванне творчасці мастацкіх калектываў і індывідуальных выканаўцаў размоўнага жанру, накапленне і сістэматызацыя скарбаў вуснай народнай творчасці, узбагачэнне духоўнага свету насельніцтва здабыткамі фальклорнага і сучаснага эстраднага мастацтва (паэтычная і празаічная формы), развіццё, павышэнне сцэнічнай культуры і выканальніцкага майстэрства творчых груп і індывідуальных выканаўцаў размоўнага жанру.
3. Арганізатарамі Конкурсу з'яўляюцца: галоўнае ўпраўленне ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Гродзенскага аблвыканкама, ДУК "Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці".
4. Конкурс праводзіцца 1 раз у 2 гады.
5. Конкурс праводзіцца ў 2 туры: І тур – раённыя (гарадскія) этапы (люты - красавік), ІІ тур – абласны, заключны этап (май).
6. Аддзелы ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі гаррайвыканкамаў, раённыя (гарадскія) цэнтры культуры і народнай творчасці па выніках адборачных тураў вызначаюць лепшых выканаўцаў і прадстаўляюць не больш 3-х заявак (творчы калектыў, асобны выканаўца) для ўдзелу ў ІІ туры.
7. У Конкурсе могуць прымаць удзел калектывы аматарскай творчасці і індывідуальныя выканаўцы размоўнага жанру незалежна ад ведамаснай прыналежнасці і без абмежавання ўзросту.
8. Канкурсанты рыхтуюць да выканання празаічныя альбо паэтычныя творы розных жанраў мастацкага слова.
9. Працяг конкурснай праграмы павінен складаць не больш за 5 хвілін.
10. Пераможцы Конкурсу ўзнагароджваюцца дыпломамі лаўрэата (І, ІІ, ІІІ месца) і прызамі ў наступных намінацыях: народная проза (легенды, паданні, апавяданні, казкі); проза, інсцэніроўка празаічнага твора; паэзія, інсцэніроўка паэтычнага твора; камедыйна-сатырычныя творы (гумарэскі, байкі, інтэрмедыі, анекдоты, пародыі).

11. Вызначаюцца таксама пераможцы ў спецыяльных намінацыях: "За ўдалае ўвасабленне аўтарскага твора", "За ўдалы дэбют", За лепшы аўтарскі твор", "За акцёрскае майстэрства", "За шанаванне традыцый беларускага гумару", "За ўдалае ўвасабленне жаночага вобраза", "За ўдалае ўвасабленне актуальнай тэмы", "За лепшае раскрыццё тэмы вайны і патрыятычнае выхаванне моладзі".

12. Астатнія ўдзельнікі Конкурсу ўзнагароджваюцца дыпломамі за ўдзел.

13. Журы пакідае за сабой права змяняць альбо вызначаць дадатковыя намінацыі.

14. Пры падвядзенні вынікаў журы карыстаецца наступнымі крытэрыямі:

- адпаведнасць мэтам і задачам конкурсу;
- сцэнічная культура і культура мовы;
- мастацка-эстэтычны ўзровень рэпертуару, выкарыстанне сучаснага і рэгіянальнага матэрыялу;
- арыгінальнасць манеры выканання, артыстызм.

15. З мэтай творчай вучобы на Конкурс запрашаюцца кіраўнікі тэатральных калектываў, кіраўнікі гурткоў мастацкага чытання.

16. Фінансаванне абласнога конкурсу выканаўцаў размоўнага жанру ажыццяўляецца за кошт сродкаў абласнога бюджэту, прадугледжаных у каштарысе ДУК "Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці" .

17. За кошт бюджэтных сродкаў фінансуюцца: вядучыя (2 чал.); набыццё прызоў, рамак і дыпломаў; аплата членам журы.

18. Для фінансавання абласнога конкурсу выканаўцаў размоўнага жанру могуць быць выкарыстаны іншыя крыніцы, не забароненыя заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

19. Арганізатары Конкурсу захоўваюць неабмежаваныя правы на запіс і распаўсюджванне выступленняў калектываў і выканаўцаў рознымі тэхнічнымі сродкамі і спосабамі. За дадзеныя запісы ганарары выканаўцам не выплачваюцца.

Дадатак да інструкцыі
аб парадку арганізацыі і
правядзення абласнога
конкурсу размоўнага жанру

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Начальнік аддзела ідэалагічнай
работы, культуры і па справах
моладзі
_______________гаррайвыканкама
________________________2018 г.

# ЗАЯЎКА

на ўдзел у абласным конкурсе выканаўцаў размоўнага жанру

1. Прозвішча, імя, імя па бацьку ўдзельніка (ці назва калектыву)________

___________________________________________________________

2. Базавая ўстанова дзейнасці (поўная назва) ________________________

___________________________________________________________

3. Намінацыя *(неабходнае падкрэсліць)*
   - народная проза (легенды, паданні, апавяданні, казкі);
   - проза, інсцэніроўка празаічнага твора;
   - паэзія, інсцэніроўка паэтычнага твора;
   - камедыйна–сатырычныя творы (гумарэскі, байкі, інтэрмедыі, анекдоты, пародыі)

4. Назва твора *(аўтар, назва, (калі і ад каго запісана – для фальклорных твораў)*

___________________________________________________________

5. Працягласць выступлення_____________________________________

6. Прозвішча, імя, імя па бацьку мастацкага кіраўніка калектыву ________

___________________________________________________________

7. Пашпартныя дадзеныя (нумар, калі і кім выданы) мастацкага кіраўніка калектыву ці асобнага выканаўца_______________________________

___________________________________________________________

8. Узрост удзельніка(аў)________________________________________

9. Месца працы (вучобы) ўдзельніка(аў)___________________________

___________________________________________________________

10. Неабходнае тэхнічнае забеспячэнне, гукавы носьбіт (флэш-карта,CD)

___________________________________________________________

11. Кантактныя тэлефоны_______________________________________

Кіраўнік базавай установы ________________
*(подпіс)*

Заяўкі на ўдзел у аглядзе-конкурсе, а таксама электронную версію конкурснага твора дасылаць да 1 мая, па адрасе:230025, г. Гродна, ДУК “Гродзенскі АМЦНТ”, вул. Савецкая, 8 з паметкай “ на конкурс размоўнага жанру”. Тэл. 8 (0152) 74 36 10, мтс 5873956, тэл/факс: 72 27 04,E-mail: onmcnt@tut.by, onmcnt@mail.ru.